ного узора, который в нх творчестве достиг виртуозной стилизации форм. Как бы продолженнем фасадной стены являются арочные ворота с пышным пластическим и цветовым декором.

Характерными признаками ворот данного ансамбля являются солярные символы в виде квадратов или ромбов, а также ажурный резной декор, доведенный до ювелириой проработки. Ансамбль жилипца дополняют изгороди и колодцы, которые решаются в стнле декоративиой отделки жилья. Изгородн богаты не только пластическими формами конфигурации штакетннка, но и накладными ажурнымн элементами.

Цветовой строй жилнща самый богатый из всех выше рассмотренных. Измельченный пластнческий декор в четкой последовательности и ритмике отделывается цветом. В отделке жилнща используются от четырех до шести цветовых тонов, сгармонированных в единый ансамбль. Эта богатая орнаментика народной архитектуры созвучна с богатством форм и колорнта в народном ткачестве.

При созданни музеев народной деревянной архитектуры необходнмо исходить не только из планнровочно-конструктивных особенностей строений, но учитывать и декоративную отделку, которая уснлнвает своеобразие ансамбля жилища того или иного регнона.

***Юлія Захарына***

## Пераемнасць народных традыцый у архітэктуры сучаснай вёскі

Зварот да гісторыка-культурнай спадчыны ў эпоху панавання постмадэрнізму прывёў да актывізацыі вывучэння нацыянальных традыцый дойлідства. Пошукі новых сродкаў выразнасці накіраваны на ўзнаўленне нацыяиальнага аблічча гарадоў і пасёлкаў. У большасці тэарэтычных поглядаў на сучасную архітэктуру прысутнічае думка аб неабходнасці пераасэнсавання гіста-

рычных традыцый. Так, па меркаванні Рэза Азамі, актуальнае пытанне аб нацыянальных рысах у архітэктуры рэгіёнаў сёння выклікае неабходнасць вывучэння традыцыйных рыс дойлідства. Глыбокае і ўсебаковае асэнсаванне традыцый можа даць ключ да стварэння сучаснай архітэктурнай тэорыі, на падставе якой можа быць народжана новая архітэктура [1]. Такую ж думку сцвярджае В.Аладаў, які лічыць, што «высокая архітэктура ствараецца толькі ў тым выпадку, калі яна абапіраецца на нацыянальную культуру ў спалучэнні з перададой навукай і тэхналогіяй» [2].

У абліччы сучасных пасёлкаў яскрава выяўляюцца рэгіянальныя рысы, абумоўленыя прыродна-кліматычнымі асаблівасцямі, мясцовымі будаўнічымі і мастацкімі традыцыямі, характарам вытворчасці і ладам жыцця насельніцтва. Аднак планіровачная будова пасёлка і яго архітэктура адлюстроўваюць не толькі традыцыі народнага дойлідства, але і тыя зрухі, якія адбываюцца пад уплывам прагрэсіўных зменаў тэхналогій, арганізацыі і размяшчэння сельскагаспадарчай вытворчасці, у бытавым укладзе і вобразе жыцця сельскага насельніцтва. Таму архітэктурная забудова і планіроўка сельскіх месцаў не можа быць стабільнай і змяняецца з часам [3]. У выніку зменаў традыцый у сельскім дойлідстве пад уплывам тэхнікі і сусветных мастацка-стылістычных тэндэнцый XIX–XX стагоддзяў многія пасёлкі пачалі губляць сваё гістарычнае аблічча. Таму асноўнай задачай сучаснага сельскага архітэктара стаў працяг пошукаў і вызначэнне традыцыйных рыс дойлідства, якія павінны спалучацца з эканамічнасцю будаўніцтва і эксплуатацыі пабудоваў, што адпавядаюць спецыфіцы сельскага вобраза жыцця [4].

Праблема архітэктурна-мастацкага аблічча нашага сучаснага сяла займае адно з цэнтральных месцаў у шэрагу пытанняў планіроўкі і забудовы сельскіх пасёлкаў. Сельскай архітэктуры здаўна ўласціва індывідуальнасць, якая выяўляецца ў творчым спалучэнні лепшых дасягненняў традыцый народнага дойлідства і

сучасных магчымасцяў дойлідства. Блізкасць да прыроды, якая непасрэдна адлюстроўвае саму сутнасць сельскай гаспадаркі, спецыфіка фермерскіх збудаванняў, значна меншая ў параўнанні з гарадамі велічыня пасёлкаў, іншы характар забудовы адбіліся на абліччы населеных пунктаў.

Асаблівае значэнне набывае гісторыка-архітэктурны фактар мастацкай выразнасці. У фарміраванні індывідуальнага архітэктурна-мастацкага аблічча сельскага пасёлка пэўнае месца належыць помнікам гісторыі і культуры. Гістарычныя помнікі архітэктуры, уключаныя ў сучасную забудову пасёлка, узбагачаюць архітэктурную прастору і выступаюць адным са сродкаў мастацкай выразнасці. Часта гістарычныя помнікі вызначаюць стылістычныя асаблівасці новай забудовы. Размяшчэнне побач з архітэктурнымі помнікамі грамадскіх цэнтраў ці будынкаў спрыяе захаванню вядучага значэння першых і адначасова акцэнтуе іншыя.

Традыцыі народнага дойлідства ў пераасэнсаваным выглядзе знайшлі ўвасабленне ў пабудове комплекснага прадпрыемства бытавога абслугоўвання ў вёсцы Балонь Мінскай вобласці (1980 год, арх. М.Мацеўшук). Мастацка-вобразная задума накіравана на выяўленне канструкцыйных асаблівасцяў традыцыйнага беларускага жытла. Архітэктурна-прасторавая кампазіцыя выканана ў формах двухсхільнага даху. Дэкаратыўнае абрамленне схілаў даху выяўляе характэрную для беларускага народнага жылля страпільную канструкцыю. Улік гісторыка-архітэктурнага фактара мастацкай выразнасці адбіўся на кампазіцыйнай задуме пабудовы. Адносна невялікія памеры будынка, архітэктурнае вырашэнне, накіраванае на выяўленне форм і канструкцый беларускага народнага дойлідства, паспрыялі выяўленню нацыянальнага характару збудавання. Агульнае архітэктурна-мастацкае вырашэнне будынка прадпрыемства бытавога абслугоўвання з захаваннем агульнай стылістычнай лініі забудовы вёскі дазволіла атрымаць выразную ансамблевую кампазіцыю.

Пасля доўгачасовага перапынку аднаўляецца ў пасёлках і на вёсках будаўніцтва храмаў, дзе ў большай ступені захаваліся нацыянальныя традыцыі. У 1990-х гадах узводзіцца Свята-Пакроўская царква ў вёсцы Дзвінаса Лагойскага раёна. Агульная архітэктурна-мастацкая задума адпавядае традыцыям народнага дойлідства. Аб гэтым сведчыць і само размяшчэнне храма, які пастаўлены на ўскрайку вёскі на могілках. Суцэльны драўляны аб'ём будынка царквы вырашаецца зрубнай канструкцыяй. Простай і традыцыйнай з'яўляецца архітэктурна-прасторавая кампазіцыя, якая мае трохчасткавую структуру. Асноўная частка ў плане мае форму прамавугольніка. Алтарная частка вырашана пяціграннай апсідай. У аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю царквы ўключана невялічкая званніца, вырашаная вежавай формай пад шатровым пакрыццём даху. Асноўны аб'ём, а таксама прытвор перакрыты двухсхільным дахам, які пераходзіць у вальмавы над алтарнай часткай. Складзеная з бруса царква пазбаўлена ўсялякіх дэкаратыўных упрыгожванняў. Мастацкая выразнасць дасягаецца самой канструкцыяй пабудовы, а таксама аб'ёмна-прасторавым вырашэннем.

У традыцыях народнага дойлідства выканана і пабудова Свята-Петра-Паўлаўскай царквы ў гарадскім пасёлку Багушэўск Сенніцкага раёна. Узведзеная ў сярэдзіне 1990-х гадоў драўляная царква мае прыбудову з сілікатнай цэглы, якая служыць прытворам. Канструкцыйнае вырашэнне царквы прадстаўлена зрубам з брусковых бярвенняў, якія злучаюцца ў вугал з астаткам. Такі прыём спалучэння сцен атрымаў назву «рыбі хвост» і ўжываўся ў беларускім народным дойлідстве пры будаўніцтве жылля, гаспадарчых і культавых пабудоваў. Асноўны прамавугольны ў плане аб'ём перакрыты двухсхільным дахам, у цэнтральнай частцы якога на светлавым барабане пакоіцца цыбулепадобны купал. Сам барабан узведзены ў формах васьмірыка на чацверыку, у чым бачны ўплыў руска-візантыйскіх традыцый. Драўляная чатырохгранная званніца, якая ўва-

ходзіць у комплекс царквы, надбудавана над прытворам і перакрыта шатровым дахам, які завяршаецца макаўкай. Сярод дэкаратыўных элементаў аздаблення знайшлі ўжыванне разныя падзоры, што ўпрыгожваюць карнізы царквы.

З найбольшай паўнатой увасобіліся народныя традыцыі ў сучасным сельскім жыллёвым дойлідстве. Своеасаблівасць аб'ектаў жыллёвай архітэктуры фарміравалася пад уплывам асаблівасцяў планіровачных, канструкцыйных і кампазіцыйна-мастацкіх вырашэнняў.

У 1980-х гадах у пасёлку Жамчужны ўзводзяцца аднакватэрныя жылыя дамы драўляна-панельнай канструкцыі (арх. І.Некрашэвіч, А.Корбут). Даволі простае архітэктурна-прасторавае вырашэнне ўяўляе набліжаны да куба аб'ём, перакрыты высокім двухсхільным дахам. З боку галоўнага фасада, у аздабленні якога адсутнічаюць чыста дэкаратыўныя элементы, размяшчаецца ўваход, да якога вядуць сходы з драўлянай агароджай. Бакавы фасад мае традыцыйную для народнага беларускага жылля прыбудову, якая функцыянальна адпавядае летняй адкрытай верандзе, размешчанай пад навессю схілу даху. Гістарычна такія прыбудовы адпавядалі сенцам двухчасткавай структуры жылля: хата + сенцы, распаўсюджанай на Беларусі. Ужыванне традыцыйных матэрыялаў у канструкцыі пабудоваў, сама простая структура кампазіцыі сведчаць аб пранікненні ў сельскае жыллё рысаў народнага дойлідства.

Тэндэнцыя да пераасэнсавання і захавання народных традыцый дойлідства атрымала найбольш яскравыя праявы ў мастацкім абліччы жылых дамоў сядзібнага тыпу, а таксама ў будынках, узведзеных па індывідуальных праектах. У 1970–90-я гады на Беларусі галоўным чынам будуюцца аднакватэрныя сядзібныя жылыя дамы. Яны для вялікіх і сярэдніх сем'яў, якія вядуць уласную гаспадарку. Звычайна сядзібныя дамы ўзводзяцца на адасобленым участку і маюць непасрэдны выхад з кватэры на прысядзібны ўчастак.

Яскравым прыкладам аднапавярховага аднакватэрнага жылога дома з'яўляецца жылы дом, узведзены ў пасёлку Сухары Мінскай вобласці (арх. М.Даўгіх). Даволі простае архітэктурна-мастацкае вырашэнне атрымала кампактная ў плане кампазіцыя пабудовы. Ва ўсім абліччы будынка дакладна праглядаюцца рысы народнага жыллёвага дойлідства. Адносна невялікі аб'ём, перакрыты двухсхільным дахам, у плане мае прамавугольную форму. У канструкцыі жылога дома ўжываюцца традыцыйныя матэрыялы – дрэва і цэгла. Фасады пабудовы пазбаўлены дэкаратыўнага аздаблення. Яго ролю бярэ на сябе сама канструкцыя. Спалучэнне драўляных панэляў і цэглавай кладкі сцен пры рытмічным чаргаванні надаюць своеасаблівы мастацкі каларыт, уласцівы традыцыйнаму беларускаму жыллю.

У практыцы праектавання і забудовы сельскіх населеных месцаў Беларусі 1970–90-х гадоў вялікае распаўсюджанне атрымалі жылыя дамы мансарднага тыпу. Цікавым архітэктурна-мастацкім вырашэннем вылучаецца аднакватэрны жылы дом з гаражом, пабудаваны ў пасёлку Мышкавічы Магілёўскай вобласці (арх. Т.Галіёта, В.Кожар). Канструкцыйна-планіровачная структура даволі простая. Асноўны, набліжаны да куба аб'ём перакрыты двухсхільным дахам. Да аднаго з фасадаў прымыкае прыбудова, якая функцыянальна адпавядае летняй адкрытай тэрасе пад навессю даху, вырашаная драўлянай канструкцыяй. Мастацкая прапрацоўка яе ўключае дэкаратыўную разьбу па дрэве, што мае ў аснове традыцыйны народны арнамент. Дэкаратыўная арнаментыка з геаметрычным матывам стылістычна працягвае тэму ў агароджах лоджыі другога ўзроўню і прыбудовы ўваходнай часткі з боку супрацьлеглага фасада, а таксама па краях даху. Дэкаратыўнае аздабленне атрымаў і ўезд у гараж з мастацкім абрамленнем каменнай кладкай і фурнітурай з геаметрычным матывам створак варот. Багатае дэкаратыўнае аздабленне простага архітэктурна-канструкцыйнага вырашэння аб'ёму робіць яго унікальным.

У цэлым жыллёвая архітэктура сельскіх населеных месцаў Беларусі 1970–90-х гадоў пры ўсёй разнастайнасці мае агульныя рысы. Звычайна жылы дом уяўляе кампактную ў плане пабудову з дастаткова простай архітэктурна-планіровачнай структурай. Жылыя дамы вышынёй ад аднаго да чатырох паверхаў з арганізацыяй добраўпарадкавання тэрыторыі выяўляюць імкненне да арганічнай сувязі прыроднага і архітэктурнага асяроддзя. У мастацка-стылістычных адносінах менавіта сельскія жылыя будынкі з найбольшай паўнатой захоўваюць, увасабляюць і адлюстроўваюць рысы народнага дойлідства.

1. *Реза Азами.* Традиционная архитектура Ирана и современность / / Научно-информационный вестник БААРХ. – Вып. 1. – Мн., 2003. – С. 45.
2. Аладов В.Н. Состояние и перспективы развития архитектуры жилых зданий // Научно-информационный вестник БААРХ. – Вып. 1. – Мн., 2003. – С. 21.
3. Архитектура сел Украины / Под ред. З.В.Моисеенко, Н.Н.Косенко, Ю.А.Косенко. – Киев, 1987. – С. 30.
4. Архитектура села и творческие задачи архитекторов: IX пленум правления СА СССР. Москва, 20-21 декабря 1979 г. / Под ред. С.Б.Сперанского. – М., 1980. – С. 30.

***Валянцін Собаль***

## Археалагічнае вывучэнне сядзібы Манюшак у маёнтку Убель

Месца, дзе знаходзіўся маёнтак Убель, ляжыць праз 40 км на паўднёвы ўсход ад Мінска. Цяпер гэта Чэрвеньскі раён Мінскай вобласці. У канцы XVIII стагоддзя Убель уваходзіў у склад Смілавіцкага графства і пачаргова належаў Сапегам, Завішам, Агінскім [1].

У 1791 годзе маёнтак адышоў да Станіслава Манюшкі (дзеда кампазітара), а ў 1815 годзе перайшоў яго сыну Чэславу, які быў у шлюбе з Альжбэтай Маджарскай. Менавіта ў гэтай убельскай сядзібе ў 1819 годзе нарадзіўся будучы славуты кампазітар, заснавальнік польскай